Источник: "Беларускі гістарычны часопіс" - №2, 2015-02-24





# КІРЫЛІЧНЫЯ ВЫДАННІ XVI—XVIII стст. у зборах Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі

*Адной з каштоўнейшых калекцый, што захоўваецца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, з'яўляецца калекцыя кірылічных выданняў XVI—XVIII стст. У ёй прадстаўлены старадрукі з розных друкарняў і гарадоў. Найбольшую цікавасць уяўляюць кнігі, што былі надрукаваныя на беларускіх землях.*

У 1964 г. у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі быў створаны аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў. Вялікая заслуга ў фарміраванні фонду аддзела належыць аднаму з першых яго загадчыкаў Л.І.Збралевіч[1]. Яна выяўляла і адбірала рэдкія і каштоўныя выданні з агульнага сховішча ЦНБ НАН Беларусі, а таксама ў запасніках іншых бібліятэк, як у самой Беларусі, так і за яе межамі, вяла перапіску з уладальнікамі прыватных збораў з мэтай набыць у іх рэдкія выданні.

Адным з самых каштоўных збораў аддзела з'яўляецца калекцыя кірылічных выданняў XVI — пачатку XX ст. Яна фарміравалася з розных крыніц: кнігі паступалі з рэзервовых фондаў бібліятэк былога СССР, у першую чаргу з Дзяржаўнай бібліятэкі СССР імя У.І.Леніна (цяпер Расійская дзяржаўная бібліятэка), набываліся ў прыватных асоб.

У цяперашні час гэтая калекцыя налічвае 548 асобнікаў. 482 з іх датаваныя XVI—XVIII стст. У асноўным гэта літургічныя выданні: Біблії, жыцці святых, мінеі, пацерыкі, псалтыры і інш. Прадстаўлена таксама і вучэбная літаратура: Берында Памва. Лексикон славеноросский (Кутейна, 1653); Магницкий Леонтий. Арифметика (Москва, 1703); Смотрицкий Мелетий. Грамматика (Москва, 1721); Азбука (Супрасль, 1781).

У калекцыі пераважаюць выданні расійскіх друкарняў (199 выданняў, 223 асобнікі) з гарадоў Клінцы, Масква, Ноўгарад, Санкт-Пецярбург, на другім месцы — выданні друкарняў Украіны (125 выданняў, 147 асобнікаў) з гарадоў Кіеў, Крылас, Львоў, Астрог, Пачаеў, Рахманава, Унеў, Чарнігаў, на трэцім — выданні з беларускіх друкарняў (69 выданняў, 83 асобнікі) з гарадоў Вільня, Гродна, Еўя, Заблудава, Куцейна, Магілёў, Супрасль. Ёсць адзінкавыя асобнікі з друкарняў Польшчы (Варшава), Румыніі (Ясы).

Досыць шырока ў калекцыі прадстаўлены выданні старавераў, перыяд станаўлення кнігадрукарскай дзейнасці якіх прыпаў у тым ліку і на XVIII ст. Усяго налічваецца 62 такіх выдання (69 асобнікаў), гэта ў асноўным псалтыры (5 асобнікаў), пралогі (5), евангеллі (4), часоўнікі (4), часасловы (4). Самае ранняе стараабрадніцкае выданне ў фондзе бібліятэкі — "Псалтирь с восследованием" магілёўскай друкарні датаванае 1705 г.

Сярод найбольш значных выданняў калекцыі кірылічных кніг варта адзначыць кнігі Івана Фёдарава і Пятра Мсціслаўца (5 выданняў, 6 асобнікаў). З іх адно сумеснае ("Евангелие учительное" (Заблудов, 1569)) пачатковага перыяду дзейнасці гэтых друкароў, наступныя — асобныя, два віленскія выданні Пятра Мсціслаўца ("Евангелие" 1575 г. і "Псалтирь" 1576 г.), а таксама два астрожскія выданні Івана Фёдарава ("Новый завет з Псалтирью" 1580 г., "Библия" 1581 г.).

Чатыры асобнікі гэтых выданняў былі набытыя ў 1973 г. у патомнага старавера, калекцыянера М.С.Севасцьянава. Усяго ў яго было набыта 50 старадрукаваных кніг[2]. Гэта літургічныя выданні, вялікая частка якіх датаваная XVII ст. (29 асобнікаў), выданні XVI і XVIII стст. прадстаўленыя практычна аднолькавай колькасцю асобнікаў (11 і 10 адпаведна). У асноўным гэта кнігі маскоўскіх друкарняў (29), друкарні іншых гарадоў прадстаўленыя значна менш (Вільня — 4 асобнікі, Кіеў — 3, Астрог — 2 і інш.).

У цяперашні час кнігі з калекцыі М.С.Севасцьянава захоўваюцца таксама ў Кабардзіна-Балкарскім універсітэце, у Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы, у Сібірскім аддзяленні Расійскай акадэміі навук[3], у Нацыянальнай бібліятэцы Украіны імя У.І.Вярнадскага[4].

Упершыню апісанне калекцыі кірылічных выданняў бібліятэкі было прадстаўлена супрацоўнікам ад-



Алена Цітавец, Вольга Губанава. Кірылічныя выданні XVI-XVIII стст. у зборах Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі

Источник: "Беларускі гістарычны часопіс" - №2, 2015-02-24





*Разварот кнігі "Евангелие", выдадзенай Пятром Мсціслаўцам у Вільні ў 1575 г.*

дзела рэдкіх кніг і рукапісаў В.В.Білевіч[5]. Яна ахарактарызавала гэты кніжны збор у цэлым, прывяла кароткае апісанне асобнікаў выданняў беларускіх друкарняў XVI—XVIII стст.

Бібліятэкар Н.А.Яфімава разгледзела і сістэматызавала запісы, што захаваліся на старонках кірылічных кніг ЦНБ НАН Беларусі[6]. Асобнікі з фондаў акадэмічнай бібліятэкі адлюстраваныя ў каталогах вядомых беларускіх кнігазнаўцаў Г.Я.Галенчанкі, Ю.А.Лабынцава і іншых даследчыкаў[7]. На жаль, у іх маюцца недакладнасці, не ўсе асобнікі ўведзеныя ў навуковы зварот.

У 2014 г. у аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў распачата работа па стварэнні каталога кірылічных выданняў беларускіх друкарняў XVI—XVIII стст. Вялікая ўвага пры складанні каталога надаецца характарыстыцы кожнага асобніка і гісторыі яго існавання да паступлення ў ЦНБ НАН Беларусі. Складальнікі каталога абапіраюцца на вопыт айчынных і замежных калегаў, у тым ліку выдадзены ў 2003 г. двухтомны каталог старадрукаў кірылічнага шрыфту расійскай даследчыцы А.А.Гусевай[8].

Пры апісанні асаблівасцяў дакумента выкарыстоўваецца методыка А.С.Зёрновай, правілы складання бібліяграфічнага апісання старадрукаў, падрыхтаваныя І.М.Палонскай і Н.П.Чаркашынай, рэкамендацыі І.В.Паздзеевай, а таксама іншых даследчыкаў старадрукаў[9]. Пры апісанні паперы выкарыстоўваюцца даследаванні Я.Л.Неміроўскага, Н.П.Бондар[10].

Праводзіцца работа па выяўленні вадзяных знакаў і штэмпеляў са спасылкай на вядомыя альбомы С.А.Клепікава, Э.Лаўцявічуса, Я.Сінярскай-Чапліцкай і інш.[11], а таксама на сучасны беларускі каталог "Філіграні архіўных дакументаў Беларусі XVI — пачатку XX ст." В.С.Пазднякова[12]. Вызначаецца ступень падабенства знака асобніка і знака ў альбоме ("падобны", "вельмі падобны", "блізкі", "тоесны"). Аднак на практыцы часта бывае складана выбраць з некалькіх выяўленых знакаў, прадстаўленых у альбомах, найбольш блізкі да канкрэтнага знака ў дадзеным экзэмпляры. Часам складанасці ў вызначэнні вадзяных знакаў абумоўленыя фізічным станам асобніка: на пашкоджаных старонках частка вадзянога знака можа адсутнічаць, а на аркушах, што прайшлі рэстаўрацыю, філіграні дрэнна бачныя.

У калекцыі кірылічных выданняў ЦНБ НАН Беларусі шмат няпоўных асобнікаў. У асобных кніг нумарацыя апынулася зрэзанай, а паслядоўнасць лістоў парушылася. Так, у экзэмпляры "Евангелия"[13] (Вільня, 1575)



Алена Цітавец, Вольга Губанава. Кірылічныя выданні XVI-XVIII стст. у зборах Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі

Источник: "Беларускі гістарычны часопіс" - №2, 2015-02-24



амаль усе лісты ў кніжным блоку пераблытаныя. У экзэмпляры "Псалтири" (Вільня, 1576) захаваліся толькі цэнтральныя часткі арыгінальных аркушаў, якія пры рэстаўрацыі ў XIX ст. былі ўклееныя ў новыя рамкі. Цікава, што на асобных рукапісных аркушах гэтай кнігі знаходзяцца дадатковыя тэксты. Рукапісныя аркушы (1-2) у пачатку кнігі ўтрымліваюць малітвы да чытання Псалтыра: *"Разумно дабудеть како начати иноку wсобь пети псалтырь"*, — якія адсутнічаюць ва ўсіх экземплярах, што захаваліся, але, па звестках І.П.Каратаева, былі ў арыгінальным друкаваным выданні[14]. Пасля аркуша 203 уплецены тры аркушы з малітвасловаў, якія чытаюцца *"по совершенеи же неколикихъ кафисмъ. Или всего псалтыря"* (у арыгінальным выданні адсутнічаюць). Пасля 245 аркуша замест страчанага тэксту змешчаны іншы рукапісны тэкст.

Такім чынам, у працэсе работы над каталогам выяўляюцца асобнікі, якія патрабуюць асаблівай увагі і дадатковых даследаванняў.

Адным з найменш распрацаваных раздзелаў апісання старадрукаў лічыцца апісанне пераплёту. Часта ўзнікаюць складанасці з яго датаваннем, паколькі часам за перыяд свайго існавання кніга змяніла па два-тры пераплёты, у асобных выпадках пры рэстаўрацыі выкарыстоўваліся старыя пераплёты іншых выданняў.

Адзін з асобнікаў "Евангелия" (Вільня, 1575)[15] апынуўся ў нетрадыцыйным пераплёце, на верхняй і ніжняй вечках якога нанесена эмблема ордэна езуітаў — залатое сонца з літарамі "IHS". Магчыма, гэты асобнік некалі належаў аднаму з езуіцкіх калегіумаў, якія дзейнічалі на беларускіх землях.

Такім чынам, многія з элементаў характарыстыкі асобніка даюць багаты матэрыял для даследавання. Перад складальнікамі каталога стаіць задача выявіць усе асаблівасці і максімальна поўна прадставіць кожную кнігу.

---

[1] Стефанович А.В. Отдел редких книг и рукописей ЦНБ НАН Беларуси: история в лицах и материалах // Информационное обеспечение науки Беларуси: к 80-летию со дня основания ЦНБ им. Якуба Коласа НАН Беларуси: сб. науч. ст. Мн., 2004. С. 134—142.

[2] Согласно книге суммарного учета фонда № 1, у М.Севастьянова было куплено 113 книг (50 старопечатных и 63 рукописных) на сумму 6250 рублей. Запись в инвентарной книге отдела редких книг и рукописей Ср1—Ср2475 от 12.06.1973 под № 314.

[3] Казанцева Т.Г. Певческие рукописи "собственного собрания С.Ф.Севастьянова" в фондах научных учреждений Новосибирска. URL: //http://conf.nsc.ru/files/conferences/confer_2012/abstracts /130643/137000/... (дата обращения: 10.03.2014).

[4] Бондар Н.П. Видання Івана Федорова та Петра Мстиславця з фондів Національної бібліотеки України імені В.І.Вернадського: дослідження: попримірниковий опис. Київ, 2012. С. 42-43.

[5] Билевич В.В. Белорусские книги кирилловской печати XVI—XVII веков в фондах ФБАН БССР// Из истории книги в Белоруссии. Мн., 1976. С. 93—112; Билевич В.В. Белорусские книги кирилловской печати XVIII века в фондах ЦНБ АН БССР// Книга в Белоруссии: книговедение, источники, библиография. Мн., 1981. С. 13—26.

[6] Ефимова Н.А. Записи XVI—XVII вв. на книгах кирилловской печати// История книги, источниковедение и библиотечное дело. Мн., 1984. С. 61—76.

[7] Кніга Беларусі, 1517—1917: зв. кат./ Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У.І.Леніна, БелСЭ; склад.: Г.Я.Галенчанка [і інш.]. Мн., 1986; Лабынцев Ю.А. В помощь составителям сводного каталога старопечатных изданий кирилловского и глаголического шрифтов: методические указания. Вып. 3. Кирилловские издания Супрасльской типографии. М., 1978. 54 с.

[8] Киреева Г.В., Трифонова Н.Я. Книги кирилловского шрифта XVI — начала XX в. в собрании Национального художественного музея Республики Беларусь: альбом-каталог. Мн., 2012; Гусева А.А. Издания кирилловского шрифта второй половины XVI века: сводный каталог: в 2 кн. / под общей ред. Л.И.Сазоновой. Кн. 1-2. М., 2003.

[9] Зернова А.С. Методика описания старопечатных книг кирилловской печати// Работа с редкими и ценными изданиями: сб. ст. и инструктивных материалов. М., 1973. С. 17—96; Правила составления библиографического описания старопечатных изданий/ сост.: И.М.Полонская, Н.П.Черкашина; науч. ред. Н.П.Черкашина. 2-е изд., перераб. и доп. М., 2003; VI Школа-семинар повышения квалификации сотрудников, начинающих работу с кириллическими рукописными и печатными книжными памятниками XV—XVII вв.: методические рек. / сост. И.В.Поздеева. Ростов, 2006.

[10] Немировский Е.Л. Иван Федоров в Белоруссии. М., 1979; Бондар Н.П. Видання Івана Федорова та Петра Мстиславця з фондів Національної бібліотеки України імені В.І.Вернадського.

[11] Клепиков С.А. Филиграни и штемпели на бумаге русского и иностранного производства XVII—XX века: [справ. пособие]. М., 1959; Laucevičius E. Popierius Lietuvoje XV—XVIII a.: atlasas. Vilnius, 1967; Siniarska-Czaplicka J. Filigrany papierni położonych na obszarze Rzeczypospolitej Polskiej od początku XVI do połowy XVIII wieku. Wrocław [etc.], 1969.

[12] Філіграні архіўных дакументаў Беларусі XVI — пачатку XX ст./ склад. В.С.Пазднякоў. Мн., 2013.

[13] Шыфр: К16—18/Ср239, інвентарны нумар: Ср2003.

[14] Каратаев И.П. Описание славяно-русских книг, напечатанных кирилловскими буквами. Т. 1. С 1491 по 1652 г.// Сборник отделения русского языка и словесности Императорской Академии наук. Т. 34, № 2. СПб., 1883. С. 191—193. Спасылка дадзена па каталогу: Лукьяненко В.И. Издания кириллической печати XV—XVI вв. (1491—1600 г.). СПб., 1993. С. 153.

[15] Шыфр: К16—18/Ср239, інвентарны нумар: Ср2003.

***Алена Цітавец,*** *загадчык сектара кнігазнаўства аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ імя Якуба Коласа НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук;*

***Вольга Губанава,*** *малодшы навуковы супрацоўнік аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ імя Якуба Коласа НАН Беларусі.*



Алена Цітавец, Вольга Губанава. Кірылічныя выданні XVI-XVIII стст. у зборах Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі

Источник: "Беларускі гістарычны часопіс" - №2, 2015-02-24



# Кірылічныя выданні XVI—XVIII стст. у зборах Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі

*(да матэрыялу Алены Цітавец і Вольгі Губанавай)*





*Старонкі з кнігі “Евангелие учительное”, выдадзенай П.Мсціслаўцам у Заблудаве ў 1569 г.*





*Старонка з “Библии”, выдадзенай І.Фёдаравым у Астрозе ў 1575 г.*

Алена Цітавец, Вольга Губанава. Кірылічныя выданні XVI-XVIII стст. у зборах Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі





*Старонкі з кнігі "Евангелие", выдадзенай П.Мсціслаўцам у Вільні ў 1575 г.*







*Пераплёт "Евангелия" з эмблемай ордэна езуітаў.*











*Старонкі*
*і пераплёт кнігі*
*"Псалтирь",*
*выдадзенай*
*П.Мсціслаўцам*
*у друкарні Мамонічаў*
*(Вільня) у 1576 г.*

Источник: "Беларускі гістарычны часопіс" - №2, 2015-02-24





*Старонкі з кнігі Мялецція Сматрыцкага "Грамматика" (Масква, 1648 і 1721 гг.)*



*Старонка з кнігі Памвы Бярынды "Лексикон славенороссикий" (Куцейна, 1653 г.)*



*Старонкі з кнігі "Азбука" (Супрасль, 1781 г.)*





*Старонкі з кнігі Леонція Магніцкага "Арифметика" (Масква, 1703 г.)*